Вучэбная праграма складзена на аснове праграмы “Практыкум па беларускай арфаграфіі, арфаэпіі і пунктуацыі”: Вучэб. праграма для вышэйшых навучальных установ па спецыяльнасці 1-21 05 01 “Беларуская філалогія” (па напрамках) / Аўт.склад. З.І. Бадзевіч, С.М. Балотнікава. Мн.:БДУ, 2011. Зацверджана рэктарам Белдзяржуніверсітэта. Рэгістрацыйны № УД – 4193 / уч.

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння на пасяджэнні кафедры
________________ сучаснай беларускай мовы __________________
(назва кафедры)

21 мая 2013 г. Пратакол № 10
(дата, нумар пратакола)

Загадчык кафедры
________________ З.І. Бадзевіч
(подпіс)

Адобрана і рэкамендавана да зацвярджэння Вучэбна-метадычнай камісіяй філалагічнага факультэта_____Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта______
(назва вышэйшай навучальнай установы)

30 мая 2013 г. Пратакол № 6
(дата, нумар пратакола)

Старшыня
________________М.М. Хмяльніцкі
(подпіс)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Практыкум па беларускай арфаграфіі і арфаэпіі – неабходны практычны курс у сістэме лінгвістычных дысцыплін для студэнтаў–філолагаў. Увядзенне гэтага курса ў вучэбныя планы філалагічных факультэтаў універсітэтаў абумоўлена аб'ектыўнымі фактарамі: недастатковай лінгвістычнай падрыхтоўкай выпускнікоў сярэдніх агульнаадукацыйных школ і як вынік гэтага – невысокай арфаграфічнай пісьменнасцю абітурыентаў, пэўнымі цяжкасцямі, з якімі сустракаюцца студэнты пры засваенні курсаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы, культуры мовы і стылістыкі.

Асноўнымі задачамі курса з'яўляюцца: 1) паўтарэнне студэнтамі–першакурснікамі сістэмы арфаграфічных правілаў; 2) выпрацоўка трывалых уменняў асэнсавання ўжывання арфаграфічных правілаў; 3) паглыбленне і сістэматызацыя тэарэтычных ведаў па беларускай арфаграфіі і арфаэпіі; 4) удасканаленне навыкаў аналізу моўных з'яў; 5) павышэнне культуры мовы.

Вырашэнне гэтых задач павінна таксама садзейнічаць падрыхтоўцы студэнтаў да больш асэнсаванага ўспрыняцця і засваення курсаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы, культуры мовы і стылістыкі.

Вядучымі прынцыпамі арфаграфіі і арфаэпіі павінны стаць: улік структуры дзеянняў пры засваенні правапісу і правільнага вымаўлення (ад разгорнутых, простых да больш абагульненых), узаемасувязь розных узроўняў мовы (фанетыкі, лексікі, марфалогіі і сінтаксісу), сувязь навучання арфаграфіі і арфаэпіі з развіццём маўленчай дзейнасці.

Для выпрацоўкі трывалых арфаграфічных і арфаэпічных навыкаў неабходна перш за ўсё асэнсаванае засваенне правілаў правапісу і вымаўлення, разуменне законаў пісьма, якое выпрацоўваецца пры актыўнай пазнавальнай дзейнасці студэнтаў ва ўмовах супастаўлення (параўнання), супрацьпастаўлення як адваротнага працэсу і абагульнення.

Усведамленне правілаў дасягаецца аналітыка-сінтэтычнай працай студэнтаў пад непасрэдным кіраўніцтвам выкладчыка. На аснове аналізу прыкладаў студэнты выяўляюць умовы пэўных напісанняў і (тлумачаць арфаграмы), прыходзяць да вывадаў, якімі пасля кіруюцца пры выкананні разнастайных практыкаванняў.

У курсе практыкума неабходна даць паняцці «арфаграма», «арфаграфічны аналіз», «апорнае напісанне» паколькі яны адсутнічаюць у школьнай практыцы.

Паралельна з працай па выпрацоўцы і развіццю арфаграфічных і арфаэпічных навыкаў у курсе практыкума неабходна звяртаць увагу на пытанні павышэння культуры вуснай і пісьмовай мовы студэнтаў, каб дапамагчы ім правільна, свабодна, актыўна і творча выкарыстоўваць моўныя сродкі, максімальна павысіць сваю моўную культуру.

Мэта заняткаў па практыкуме – замацаваць і паглыбіць тэарэтычныя веды. Методыка правядзення практычных заняткаў розная: індывідуальнае, франтальнае, паслядоўна-лінейнае або выбарачнае апытванне; выкананне практыкаванняў на дошцы; работа па гатовых табліцах і схемах; выкананне

тэставых заданняў і тэстаў на камп'ютэрах, праслухоўванне і аналіз разнастайных лінгвістычных запісаў і г.д. Правільна арганізаваная сістэма практычных заняткаў спрыяе выпрацоўцы ў студэнтаў самастойных навуковых поглядаў на моўныя з'явы і працэсы, дапамагае ім грунтоўна авалодаць арфаграфічнымі і арфаэпічнымі нормамі літаратурнай мовы, паскарае набыццё навыкаў самастойнага аналізу моўных з'яў і фактаў.

Асаблівае значэнне для выпрацоўкі і замацавання трывалых арфаграфічных і арфаэпічных уменняў і навыкаў мае падбор адпаведных практыкаванняў, бо менавіта ў працэсе іх выканання адпрацоўваюцца тыя прыёмы, тыя разумовыя аперацыі, якія неабходны для асэнсавання лінгвістычных асноў арфаграфіі і арфаэпіі, для выбару адпаведнага правіла, што дае правільны ўзор напісання. Да такіх практыкаванняў могуць быць аднесены: 1) практыкаванні тыпу спісвання з прапушчанымі літарамі і знакамі прыпынку без пропускаў; 2) дыктоўкі рознага тыпу (папераджальныя, тлумачальныя, выбарачныя, свабодныя, творчыя); 3) практыкаванні творчага характару (выбарка слоў з арфаграфічнага слоўніка, выпісванне сказаў на зададзеныя арфаграмы з твораў мастацкай літаратуры, складанне тэксту, пераказ тэксту і інш.).

Адным з відаў паўтарэння і замацавання правілаў лічыцца праца над памылкамі. Развіццё ўмення аналізаваць памылкі дапамагае студэнтам удасканальваць уласныя навыкі і паглыбляць веды ў галіне беларускай арфаграфіі і арфаэпіі. Таму пасля кожнай праверачнай дыктоўкі, пераказу ці сачынення любая памылка павінна быць асэнсавана і класіфікавана. Спецыяльнымі заданнямі пры гэтым могуць быць: выпісванне з тэксту слоў з данай арфаграмай, падбор і напісанне слоў з аднолькавай арфаграмай, самадыктоўкі і інш.

У выніку вывучэння практыкума па беларускай арфаграфіі і арфаэпіі студэнты павінны ведаць:

- тыпалагічную і генетычную характарыстыку беларускай мовы;
- арфаэпічныя і арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы;
- асноўныя тэрміны і паняцці беларускай арфаграфіі і арфаэпіі;
- прынцыпы сучаснай беларускай арфаграфіі і сістэму правілаў напісання, заснаваных на адпаведных прынцыпах.

Павінны ўмець:

- валодаць вуснай і пісьмовай разнавіднасцямі сучаснай беларускай літаратурнай мовы;
- карыстацца асноўнымі моўнымі паняццямі і тэрмінамі ў іх сістэмна-структурных сувязях;
- валодаць маўленчай дзейнасцю ў сістэме стылёва-функцыянальных асаблівасцей беларускай літаратурнай мовы.

Больш складаны, чым у школе, змест заняткаў па арфаграфіі і арфаэпіі дапаможа студэнтам выявіць і ў значнай меры ліквідаваць прабелы ў сваіх ведах і падрыхтуе іх да больш асэнсаванага і глыбокага вывучэння сучаснай беларускай літаратурнай мовы, культуры мовы і стылістыкі.

## Праграма вучэбнага курса

### Уводзіны

Асноўныя задачы практыкума па арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы. Значэнне курса ў прафесійнай падрыхтоўцы. Сувязь практыкума з курсам беларускай мовы для сярэдняй школы і з курсамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы, культуры мовы і стылістыкі для ВНУ.

Паняцце арфаграмы, пунктаграмы, апорнага напісання.

### Арфаэпія

Прадмет і задачы арфаэпіі. Арфаэпія як правілы рэалізацыі фанетычнай сістэмы. Практычнае значэнне арфаэпіі.

З гісторыі фарміравання беларускага літаратурнага вымаўлення.

Асноўныя нормы сучаснага беларускага вымаўлення: вымаўленне націскных і ненаціскных галосных, вымаўленне зычных (у моцных і слабых пазіцыях). Правілы вымаўлення гукаў на стыку слоў. Вымаўленне гукаў у запазычаных словах.

Праблемы варыянтнасці на фанетычным узроўні. Арфаэпічная варыянтнасць у вакалізме і кансанантызме. Прычыны, характар і літаратурныя межы арфаэпічнай варыянтнасці ў беларускай мове.

Арфаэпічная норма і культура маўлення. Адхіленні ад норм літаратурнага вымаўлення і іх прычыны.

Асноўныя тэндэнцыі развіцця арфаэпічнай нормы на сучасным этапе.

Даведнікі па беларускай арфаэпіі.

### Арфаграфія

Арфаграфія, яе прадмет і задачы. Арфаграма і апорнае напісанне. Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі: фанетычны, фанематычны (марфалагічны), традыцыйнае і дыферэнцыйнае напісанні.

Правілы правапісу галосных, заснаваныя на фанетычным прынцыпе. Правапіс зычных паводле фанетычнага прынцыпу. Фанематычныя і традыцыйныя напісанні галосных. Правілы правапісу зычных, заснаваныя на фанематычным прынцыпе. Дыферэнцыйныя напісанні.

Прынцыпы і правілы напісання слоў злітна, асобна, праз злучок.

Ужыванне вялікай літары.

Напісанне абрэвіятур і ўмоўных скарачэнняў. Правілы пераносу.

Гісторыя станаўлення беларускай арфаграфіі. Тэндэнцыя развіцця арфаграфічнай нормы на сучасным этапе.

Даведнікі па беларускай арфаграфіі.

### Правапіс галосных

Галосныя гукі і перадача іх на пісьме сродкамі беларускай графікі. Гукавое значэнне літар *е, ё, ю, я, і.* Правапіс галосных *о, а.* Аканне. Правапіс галосных *е, ё, я.* Яканне. Правапіс спалучэнняў галосных *іё/ыё/, ія/ыя/, іе /ые/, іо/ыо/, ео/еа* ў запазычаных словах. Правапіс *ы* і *й* пасля прыставак. Правапіс прыстаўных галосных *і, а.* Правапіс галосных у складаных словах.

**Культура мовы**. Вымаўленне галосных і іх спалучэнняў у спрадвечна беларускіх словах, вымаўленне іншамоўных слоў. Назіранні над выкарыстаннем гукапісу ў паэтычнай мове.

### Правапіс зычных

Зычныя гукі і перадача іх на пісьме сродкамі беларускай графікі. Правапіс звонкіх і глухіх, свісцячых і шыпячых. Правапіс *й, ў.* Правапіс *д-дз, т-ц.* Дзеканне. Цеканне. Падоўжаныя зычныя, іх правапіс. Падвоеныя зычныя, іх правапіс. Правапіс прыстаўных зычных. Правапіс спалучэнняў зычных у корані, на стыку кораня і суфікса, прыстаўкі і кораня. Правапіс мяккага знака і апострафа.

**Культура мовы**. Вымаўленне афрыкат *[дж, дз, ц, ч],* звонкіх зычных перад глухімі і на канцы слоў, глухіх зычных перад звонкімі, свісцячых перад шыпячымі, шыпячых перад свісцячымі, свісцячых *[з, с]* перад мяккімі зычнымі, у тым ліку і перад *[г, к, х];* спалучэнняў *[сш, сч] (сшытак, перапісчык); [дч, тч] (загадчык, матчын); [жджж] (дожджж), [чн] (ручнік).* Вымаўленне слоў з асіміляцыйнай мяккасцю зычных. Назіранні над выкарыстаннем гукапісу ў паэтычнай мове.

### Напісанне слоў разам, праз злучок і асобна

Напісанне разам слоў з прыстаўкамі, складанаскарочаных і складаных слоў, утвораных на аснове падпарадкавальных словазлучэнняў. Напісанне праз злучок слоў розных часцін мовы. Напісанне асобна знамянальных самастойных слоў.

**Культура мовы.** Правільнае вымаўленне складанаскарочаных і складаных слоў; выдзяленне ў складаных словах асноўнага і пабочнага націскаў.

### Правапіс вялікай літары

Напісанне з вялікай літары першага слова тэксту і сказа; першага слова пасля выклічніка або звароткa, якімі пачынаецца сказ і пасля якіх стаіць клічнік.

Вялікая літара ў імёнах, імёнах па бацьку, прозвішчах, псеўданімах, празваннях; аднаслоўных, двухслоўных і шматслоўных назвах разнастайных тэматычных груп *(Іван Шамякін, Янка Купала, Бацька Мінай, Беларусь, Венера, Мурка (кошка), Новая Зямля, Паўночны полюс, Рэспубліка Беларусь, Вялікая Айчынная вайна і інш.).* Вялікая літара ў складанаскарочаных словах.

**Культура мовы**. Вымаўленне і напісанне складанаскарочаных слоў, дапасаванне да іх прыметнікаў і дзеясловаў прошлага часу.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

<table>
<tr><th rowspan="3">№п/п</th><th rowspan="3">Назвы раздзелаў, тэм</th><th colspan="5">Колькасць аўдыторных гадзін</th></tr>
<tr><th colspan="4">Аўдыторныя</th><th rowspan="2">Самаст. работа</th></tr>
<tr><th>Лекцыі</th><th>Практыч., семінар.</th><th>Лаб. заняткі</th><th>Аўд. кантроль КСР</th></tr>
<tr><td>1.</td><td>Арфаэпія</td><td></td><td>2</td><td></td><td></td><td>2</td></tr>
<tr><td>2.</td><td>Арфаграфія як раздзел мовазнаўства і сістэма правілаў напісання</td><td></td><td>4</td><td></td><td></td><td>2</td></tr>
<tr><td>3.</td><td>Правапіс галосных</td><td></td><td>8</td><td></td><td></td><td>2</td></tr>
<tr><td>4.</td><td>Правапіс зычных</td><td></td><td>8</td><td></td><td></td><td>2</td></tr>
<tr><td>5.</td><td>Правапіс мяккага знака і апострафа</td><td></td><td>4</td><td></td><td></td><td>2</td></tr>
<tr><td>6.</td><td>Правілы ўжывання вялікай літары</td><td></td><td>2</td><td></td><td></td><td>2</td></tr>
<tr><td>7.</td><td>Правілы пераносу слоў.<br>Правілы скарочанага напісання слоў</td><td></td><td>2</td><td></td><td></td><td>2</td></tr>
<tr><td>8.</td><td>Правілы напісання слоў разам, праз злучок (дэфіс) і асобна</td><td></td><td>4</td><td></td><td></td><td>2</td></tr>
<tr><td></td><td>Усяго:</td><td></td><td>34</td><td></td><td></td><td>16</td></tr>
</table>

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТКА

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў; <br> пералік пытанняў для вывучэння | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | Лабараторныя заняткі | аўдыторны кантроль КСР | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | **Арфаэпія.** | | **2** | | | | | |
| 1.1 | 1. Прадмет і задачы арфаэпіі. Арфаэпія як правілы рэалізацыі фанетычнай сістэмы. Практычнае значэнне арфаэпіі. З гісторыі фарміравання беларускага літаратурнага вымаўлення. <br> 2. Асноўныя нормы сучаснага беларускага вымаўлення: вымаўленне націскных і ненаціскных галосных, вымаўленне зычных (у моцных і слабых пазіцыях). Правілы вымаўлення гукаў на стыку слоў. Вымаўленне гукаў у запазычаных словах. <br> 3. Праблемы варыянтнасці на фанетычным узроўні. Арфаэпічная варыянтнасць у вакалізме і кансанантызме. Прычыны, характар і літаратурныя межы арфаэпічнай варыянтнасці ў беларускай мове. <br> 4. Арфаэпічная норма і культура маўлення. Стылі літаратурнага маўлення. Адхіленні ад норм літаратурнага вымаўлення і іх прычыны. <br> 5. Асноўныя тэндэнцыі развіцця арфаэпічнай нормы на сучасным этапе. <br> 6. Даведнікі па беларускай арфаэпіі. | | | | | Электронны падручнік | [2], [7], [10], [16]-[18], [26], [30], [31] | Пісьмовая работа (Дыктант) |
| 2 | **Арфаграфія як раздзел мовазнаўства і сістэма правілаў напісання.** | | **4** | | | | | |
| 2.1 | 1. Арфаграфія, яе прадмет і задачы. Сувязь арфаграфіі з іншымі раздзеламі мовазнаўства. Арфаграма і апорнае напісанне. Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі: фанетычны, фанематычны (марфалагічны), традыцыйнае і дыферэнцыйнае напісанні. <br> 2. Правілы правапісу галосных, заснаваныя на фанетычным прынцыпе. | | | | | Электронны падручнік | [2], [3], [9], [10], [11], [16], [20], [24], [25], [28], [30], [31] | Вуснае апытванне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Правапіс зычных паводле фанетычнага прынцыпу. Фанематычныя і традыцыйныя напісанні галосных. Правілы правапісу зычных, заснаваныя на фанематычным прынцыпе. Дыферэнцыйныя напісанні. | | 2 | | | | | |
| 2.2 | 1. Гісторыя станаўлення беларускай арфаграфіі. Тэндэнцыі развіцця арфаграфічнай нормы на сучасным этапе.<br>2. Даведнікі па беларускай арфаграфіі. | | 2 | | | | | Вуснае апытванне |
| 3 | **Правапіс галосных.** | | **8** | | | Электронны падручнік | | |
| 3.1 | 1. Галосныя гукі і перадача іх на пісьме сродкамі беларускай графікі. Гукавое значэнне літар *е, ё, ю, я, і.*<br>2. Правапіс галосных *о, э, а* ў простых па структуры словах.<br>3. Правапіс галосных *е, ё, я* ў простых па структуры словах. | | 2 | | | | [2]-[4],[6], [9]-[11], [14]-[16], [19]-[23] | Вуснае апытванне |
| 3.2 | 1. Правапіс галосных *у,ю.*<br>2. Правапіс галосных *ы, і.* | | 2 | | | | [2]-[4],[6], [9]-[11], [14]-[16], [19]-[23] | Слоўнікавая дыктоўка |
| 3.3 | Правапіс некаторых спалучэнняў галосных у запазычаных словах. | | 2 | | | | [2]-[4],[6], [9]-[11], [14]-[16], [19]-[23], [27] | Вуснае апытванне |
| 3.4 | 1. Некаторыя гістарычныя чаргаванні галосных.<br>2. Правапіс прыстаўных галосных.<br>3. Правапіс галосных у складаных і складанаскарочаных словах. | | 2 | | | | [2]-[4],[6], [9]-[11], [14]-[16], [19]-[23] | Міні-сачыненне |
| 4. | **Правапіс зычных.** | | **8** | | | Электронны падручнік | | |
| 4.1 | 1. Зычныя гукі і перадача іх на пісьме сродкамі беларускай графікі.<br>2. Правапіс звонкіх-глухіх, свісцячых-шыпячых зычных.<br>3. Правапіс *д-дз, т-ц*. Дзеканне. Цеканне. | | 2 | | | | [2]-[4], [6], [9]-[11], [14]-[16], [19]-[23] | Вуснае апытванне |
| 4.2 | 1. Правапіс *й.*<br>2. Правапіс *ў.* | | 2 | | | | [2]-[4], [6], [9]-[11], [14]-[16], [19]-[23] | Вуснае апытванне |
| 4.3 | 1. Падоўжаныя зычныя, іх правапіс. Падвоеныя зычныя, іх правапіс.<br>2. Правапіс прыстаўных зычных. | | 2 | | | | [2]-[4], [6], [9]-[11], [14]-[16], [19]-[23] | Пераклад з рускай на бел. мову |
| 4.4 | 1. Зычныя ў прыстаўках.<br>2. Правапіс спалучэнняў зычных у корані, на стыку кораня і суфікса, прыстаўкі і кораня. | | 2 | | | | [2]-[4], [6], [9]-[11], [14]-[16], [19]-[23] | Вуснае апытванне |
| 5 | **Правапіс мяккага знака і апострафа.** | | **4** | | | Электронны | | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | падручнік | | |
| 5.1 | Правапіс змякчальнага мяккага знака. | | 2 | | | | [2],[6], [9]-[11], [14]-[16] | Вуснае апытванне |
| 5.2 | Правапіс раздзяляльнага мяккага знака і апострафа. | | 2 | | | | | |
| 6 | **Правілы ўжывання вялікай літары.** | | **2** | | | Электронны падручнік | | |
| | 1. Напісанне з вялікай літары першага слова тэксту і сказа; першага слова пасля выклічніка або зваротка, якімі пачынаецца сказ і пасля якіх стаіць клічнік.<br>2. Вялікая літара ў імёнах, імёнах па бацьку, прозвішчах, псеўданімах, празваннях; аднаслоўных, двухслоўных і шматслоўных назвах разнастайных тэматычных груп. Вялікая літара ў складанаскарочаных словах. | | | | | | [1]-[6], [8]-[11], [13]-16] | Камп’ютар-ны тэст |
| 7 | **Правілы пераносу слоў. Правілы скарочанага напісання слоў.** | | **2** | | | Электронны падручнік | | |
| 7.1 | Правілы пераносу слоў | | 1 | | | | | |
| 7.2 | 1. Складанаскарочаныя словы.<br>2. Правапіс абрэвіятур.<br>3. Графічныя скарачэнні. | | 1 | | | | [6], [11], [19], [22] | Слоўнікавая дыктоўка |
| 8 | **Правілы напісання слоў разам, праз злучок (дэфіс) і асобна.** | | **4** | | | Электронны падручнік | | |
| 8.1 | 1. Агульныя правілы напісання слоў разам і праз злучок.<br>2. Напісанне складаных назоўнікаў разам і праз злучок. | | 2 | | | | [1]-[3], [5], [6], [8]-[11], [13]-[16],[29] | Пісьм. раб. (Дыктант з дадатк. зад.) |
| 8.2 | 1. Напісанне складаных прыметнікаў разам і праз злучок.<br>2. Напісанне лічэбнікаў разам і праз злучок.<br>3. Напісанне прыслоўяў разам і праз злучок. | | 2 | | | | [1]-[3], [5], [6], [8]-[11], [13]-[16],[29] | Вуснае апытванне |

# ЛІТАРАТУРА

## Асноўная літаратура

1. Адамовіч, Я.М., Касцян, М.І., Ляпешкін, В.У. Беларуская мова: Зборнік практыкаванняў / Я.М. Адамовіч, М.І. Касцян, В.У. Ляпешкін. Мінск, 1993.
2. Бадзевіч З.І. Сучасная беларуская мова: практыкум па арфаграфіі і пунктуацыі: вучэбна-метадычны дапаможнік. Мінск, 2012.
3. Беларуская мова / Пад рэд. Малажай Г.М. Мінск, 1986.
4. Беларуская мова: Цяжкія выпадкі фанетыкі, арфаграфіі, граматыкі / Пад рэд. А.І. Падлужнага. Мінск, 1987.
5. Блінава, Э.Д., Гаўрош, Н.В., Кавалёва, М.Ц. і інш. Беларуская мова: Практычны дапаможнік для абітурыентаў / Э.Д. Блінава, Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва. Мінск, I992.
6. Бурак, Л.І., Бурак, І.Л. Сучасная беларуская мова: Арфаграфія і пунктуацыя: Практыкум / Л.І. Бурак, І.Л. Бурак. Мінск, 1993.
7. Выгонная, Л.Ц. Інтанацыя. Націск. Арфаэпія / Л.Ц. Выгонная. Мінск, 1991.
8. Зборнік тэкстаў для лінгвістычнага аналізу: для студэнтаў філал. фак. / Аўт.-склад.: З.І. Бадзевіч [і інш.]. Мінск, 2005.
9. Камароўскі, Я М. Сучасная беларуская арфаграфія / Я.М. Камароўскі. Мінск, 1985.
10. Камароўскі, Я.М., Красней, В.П., Лазоўскі, У.М., Сямешка, Л.І., Шчарбакова, І.М. Сучасная беларуская мова. Уводзіны. Фанетыка. Фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Лексікаграфія. Фразеалогія. Фразеаграфія. 2-е выд. Мінск, 1995.
11. Куліковіч, У.І. Беларускі правапіс: правілы, заданні, кантрольныя работы / У.І Куліковіч Мінск, 1998.
12. Лепешаў, І.Я. Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні: Дапаможнік. / І.Я. Лепешаў. Гродна, 2002.
13. Лепешаў, І.Я., Малажай, І.М., Панюціч, К.М. Практыкум па беларускай мове / І.Я. Лепешаў, І.М. Малажай, К.М. Панюціч. Мінск, 1990.
14. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. Мінск, 2008.
15. Сямешка, Л.І. Беларуская мова / Л.І. Сямешка. Мінск, 1999.
16. Сямешка, Л.І., Шкраба, І.Р., Бадзевіч, З.І. Курс беларускай мовы / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. Мінск, 1996.
17. Янкоўскі, Ф.М. Беларускае літаратурнае вымаўленне / Ф. М. Янкоўскі. Мінск, 1976.
18. Яновіч А.І. Станаўленне графічнай сістэмы беларускай літаратурнай мовы новага перыяду // Бел. лінгвістыка. – 1987. – Вып. 31. – С.16-23.

## Дадатковая літаратура

19. Беларуская граматыка. У 2 ч. Ч.1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск. Мінск, 1985.
20. Беларуская мова: хрэстаматыя / Аўт.-склад. З.І. Бадзевіч і інш. Мінск, 2005.
21. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. Мінск, 1994.
22. Граматыка беларускай мовы. У 2 т. Т. 1. Мінск, 1962.
23. Кароткая граматыка беларускай мовы. Фаналогія. Марфаналогія. Марфалогія. Ч. 1. Мінск, 2007.
24. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. Мінск, 1959.

* * *

25. Арашонкава, Г.У., Лемцюгова, В.П. Кароткі слоўнік беларускай мовы: Правапіс. Вымаўленне. Націск. Словазмяненне. Словаўжыванне / Г.У. Арашонкава, В.П. Лемцюгова. Мінск, 1994.
26. Арашонкава Г.У., Лемцюгова В.П. Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы / Г.У. Арашонкава, В.П. Лемцюгова. Мінск,1987.
27. Бірыла М.В. Слоўнік націску ў беларускай мове / М.В. Бірыла. Мінск, 1992.
28. Булыка А.М. Слоўнік іншамоўных слоў: У 2 т. / А.М. Булыка. Мінск, 1999.
29. Лобан М.П., Суднік М.Р. Арфаграфічны слоўнік / М.П. Лобан., М.Р. Суднік. Мінск, 1990.
30. Прыгодзіч М.Р. Асобна, разам, праз дэфіс. Слоўнік-даведнік / М.Р. Прыгодзіч. Мінск, 1994.
31. Слоўнік беларускай мовы. Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне.Мінск, 1987.
32. Слоўнік беларускай мовы (цяжкасці правапісу, вымаўлення, акцэнтуацыі, словазмянення). Склад. Ламека Л.А., Ламека У.Б. Мінск, 2000.

ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ
З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| Сучасная беларуская мова | Кафедра сучаснай беларускай мовы | | Зацвердзіць<br>Пратакол № 10<br>ад 21 мая 2013 г. |
| Сучасная руская мова | Кафедра рускай мовы | | |

ЗМЕНЫ І ДАПАЎНЕННІ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ
на ___ ____/_______ вучэбны год

| №№ п/п | Змены і дапаўненні | Падстава |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры
(пратакол № ____ ад ________ 20__ _ г.)

Загадчык кафедры

_________________________ ________________ ____________________
(ступень, званне) (подпіс) (ініцыялы, прозвішча)

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта

_________________________ ________________ ____________________
(ступень, званне) (подпіс) (ініцыялы, прозвішча)